Шаланда, А. Навукова-даследчыцкі аспект у правядзенні этнаграфічная практыкі / А. Шаланда // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 2 / Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 81–83.

**А. Шаланда**

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫЦКІ АСПЕКТ У ПРАВЯДЗЕННІ ЭТНАГРАФІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Вядома, што мэтай этнаграфічнай практыкі з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў цэласных уяўленняў аб стабільных формах традыцыйных элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва пэўнага рэгіёну на падставе самастойнай творчай працы пад час выканання практычных заданняў [1, с.11]. Аднак, да выезду на месца правядзення практыкі этнографу трэба добра даследаваць гісторыю і этнаграфічныя асаблівасці раёна па тых выніках, якія ўжо ёсць у друкаваных выданнях. У сувязі з гэтым, прапануемы для этнаграфічнага даследавання рэгіён спачатку павінен быць разгледжаны з гістарычнага пункту гледжання. Па сутнасці, пры гэтым на падставе літаратуры і, па магчымасці, архіўных крыніц складаецца гістарычная справа раёну. Важнасць яе заключаецца ў тым, што яна дазваляе вызначыць або ўдакладніць мэты і задачы палявых этнаграфічных даследаванняў.

Гістарычная справа павінна ўключаць:

· высвятленне паходжання назвы або назваў (тапонімаў) населяных пунктаў, якія знаходзяцца ці знаходзіліся ў вывучаемым раёне;

· вызначэнне датаў заснавання ці першых згадкаў у крыніцах вывучаемых населяных пунктаў;

· гісторыка-краязнаўчы нарыс, у якім падаюцца: этапы развіцця паселішча, вёскі, мястэчка, гораду, іх уладальнікі, гістарычныя лакальныя назвы лясоў, лугоў, урочышчаў і г. д., мясцовыя гідронімы, спісы жыхароў, важныя падзеі, якія адбыліся ў мінулым і інш.;

· апісанне помнікаў гісторыі і культуры, этнаграфічных аб'ектаў на тэрыторыі вывучаемага раёну;

· этнаграфічныя асаблівасці раёну (на падставе матэрыялаў гісторыка-археалагічных, краязнаўчых і этнаграфічных музеяў).



Вядома, што не па ўсіх згаданых пунктах можна знайсці інфармацыю. Яна часцей за ўсё бывае няпоўнай, тым не менш, этнограф у працэсе складання справы бліжэй знаёміцца з будучым раёнам даследавання. Каб узняць якасць гістарычнай справы і яе інфарматыўнасць, на нашу думку, неабходна раней знаёміць студэнтаў з месцам планаваных этнаграфічных практык, каб яны ўжо пад час навучальнага году звярталі больш увагі на будучы раён (рэгіён) даследавання ў рамках тэарэтычных курсаў: «Этнаграфія Беларусі», «Археалогія Беларусі», «Гісторыя Беларусі» ці «Краязнаўства Беларусі».

Пад час правядзення этнаграфічнай практыкі навукова-даследчыцкая праца таксама займае адное з галоўных месцаў. Першым яе этапам з'яўляецца азнаямленне з месцам палявых этнаграфічных даследаванняў, знаёмства з мясцовымі жыхарамі.

На другім этапе праводзяцца разведкі, мэтай якіх з'яўляецца праверка інфармацыі, якая маецца ў гістарычнай справе, асабліва звяртаючы ўвагу на вызначэнне месцаў помнікаў гісторыі і культуры, а таксама этнаграфічных аб'ектаў, як тых, што захаваліся, так і тых, што былі знішчаны. Пры гэтым важна максімальна дакладна зафіксаваць іх на фота, відэа або паперу. Неабходным з'яўляецца складанне гісторыка-этнаграфічнай карты, куды наносяцца ўсе знойдзеныя гісторыка-культурныя і этнаграфічныя аб'екты. Значна дапамагаюць у згаданай рабоце архіўныя картаграфічныя матэрыялы.

Трэці этап уключае працу з мясцовым насельніцтвам, пад час якой робяцца апытанні з мэтай атрымаць дадатковую інфармацыю аб гістарычных, культурных і этнаграфічных аб'ектах: успаміны аб былых уладальніках, цікавых і вядомых людзях, гістарычных падзеях, незвычайных прыродных з'явах, змяненнях, якія адбыліся з населеным пунктам, ландшафтам, гаспадаркай і г. д.

У цэлым для правядзення навуковых даследаванняў у палявых умовах выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы:

· асабістыя назіранні;

· праца з інфарматарам (апытанне, анкетаванне);

· фіксацыя вывучаемых аб’ектаў (фота, відэа, маляванне);

· збор і сістэматызацыя як інфармацыі, так і сабраных пад час практыкі этнаграфічных рэчаў [1, с. 17].

У якасці прыкладу навуковых даследаванняў пад час этнаграфічнай практыкі можна прывесці палявую практыку са студэнтамі першага курсу гістфаку Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта, якая



праводзілася з 16 па 20 ліпеня 2002 г. у вёсцы Ябланова Гарадзенскага раёну. Пад час яе на падставе складзенай папярэдне гістарычнай спраўкі былі выяўлены:

· уніяцкая царква, пазней каталіцкі касцёл (капліца), помнік архітэктуры другой паловы XVIII—XX ст. знаходзіцца ў разбураным стане, захаваліся сцены і элементы знешняга дэкору (мясцовыя жыхары называюць яго «касцёлкам»);

· выяўлены рэшткі парку і сістэмы каналаў другой паловы XVIII—XX ст. Некаторыя элементы сістэмы каналаў выкарыстоўваюцца і сёння ў гаспадарчых мэтах. У памяці мясцовых жыхароў дзейнасць былых уладальнікаў адбілася ва ўспамінах, што: «Раней паны на лодках у лес ездзілі»;

· прыблізна вызначана месца былога ўладальніка палацу князя Ю. А. Ябланоўскага, які, верагодна, знаходзіўся на месцы сучаснай закінутай школы (месца вызначана зноў жа па апытаннях мясцовых жыхароў).

· высветлена, што назву Ябланова вёска атрымала ад Ябланоўскіх, бо на самой справе гэта была агульная назва трох вёсак, выцягнутых у адную лінію ўздоўж берага ракі Нёман — Шчэчыцаў, Кучыцаў і Ўлазаў. Апошнімі назвамі мяцовыя жыхары карыстаюцца да сёння.

Вядома, гэта толькі самыя папярэднія вынікі. Яны патрабуюць удакладнення і далейшага вывучэння на больш шырокім коле крыніц. Адное можна сёння сказаць пэўна: Беларусь у цэлым і Гарадзеншчына ў прыватнасці, страціла адную з каштоўных пэрлінаў сваёй палацава-паркавай культуры эпохі Асветніцтва.

Такім чынам, навукова-даследчыцкі аспект у этнаграфічнай практыцы дазваляе пазбегнуць сур’ёзных памылак, параўнаць сучасны стан раёна і аб’ектаў з ранейшым, замацаваць у студэнтаў атрыманыя імі пад час навучання веды. Адначасова навуковая праца знаёміць студэнтаў-этнографаў з дасягненнямі сумежных навук: гісторыяй, археалогіяй, экалогіяй і інш., што дазваляе ясней уявіць спецыфіку вывучаемага раёну (рэгіёну).

---

Методические рекомендации по практической подготовке студентов специальности Г 05.01.00 — История / Сост. Н. Л. Улейчик и др. Гродно: ГрГУ, 2001. 71 с.

Фёдараў І., Шаланда А. Палацава-паркавы комплекс у вёсцы Ябланова і яго ўладальнікі ў канцы XVIII — пачатку XX ст. (у друку).